Аўтары-складальнікі Глыбоцкай раённай гімназіі:

**Буцько Ала Васільеўна,**

настаўнік беларускай мовы і літаратуры,

**Раманчук Лідзія Анатольеўна,**

настаўнік інфарматыкі




**Буцько Ала Васільеўна,**
**настаўнік беларускай мовы і літаратуры**
**вышэйшай катэгорыі**

*211800, Беларусь, г. Глыбокае,*
*Віцебская вобласць,*
*вул.Юбілейная, д.12, кв. 2*
*тэл. дам.: 8(02156)2-17-98;*
*тэл. раб.: 8(02156)2-43-41.*
*Маб.тэл.:2192002*



**Раманчук Лідзія Анатольеўна,**
**настаўнік інфарматыкі**
**вышэйшай катэгорыі**

*211800, Беларусь, г. Глыбокае,*
*Вицебская вобласць,*
*вул. Дзяржынскага,, 8-А,*
*тэл. дам.: 8(02156)2-67-96;*
*Маб.тэл.:5931532*

e-mail: larom@tut.by




Мультымедыа-ўрок-падарожжа “Шляхам Я.Коласа”, прысвечаны 125-годдзю К.М. Міцкевіча, у гэтым навучальным годзе можна правесці ў 9 і 11’ класах. Гэты ўрок дае магчымасць здзейсніць завочнае падарожжа па мясцінах, звязаных з жыццём і творчай дзейнасцю Я.Коласа. Камп’ютэрная прэзентацыя, створаная настаўнікамі з дапамогай вучняў, наглядна, яскрава і запамінальна суправаджае ход урока ад тэмы  і задач урока да падвядзення вынікаў. Кожны слайд каменціруецца настаўнікам і вучнямі. (На ўроку працуюць усе вучні класа).

У час падрыхтоўкі да ўрока вучні класа правялі крапатлівую работу, працуючы ў 4 групах: даследчыкі, тэарэтыкі, творцы, бібліятэкары. Для адораных вучняў, якія пішуць вершы,  малююць, з’яўляецца магчымасць праявіць і рэалізаваць свае здольнасці. Дзякуючы прымяненню камп’ютэрных тэхналогій, у вучняў абуджаецца павага да беларускага слова, працэсу навучання, імкненне пазнаваць нацыянальную культуру, уменне захапляцца дзівосным светам і ўпрыгожваць яго.

**Мультымедыя - ўрок-падарожжа,**
**прысвечаны 125-годдзю К.М. Міцкевіча,**
**“Шляхам Якуба Коласа”**
**X клас**

**Задачы ўрока:**

- здзейсніць завочнае падарожжа па мясцінах, звязаных з жыццём і творчай дзейнасцю Я.Коласа;
- правесці ўрок з прымяненнем камп’ютэрных тэхналогій;
- выказаць павагу і ўдзячнасць класіку беларускай літаратуры.

**Тып урока: з выкарыстаннем камп’ютэрных тэхналогій**

**Абсталяванне ўрока:**

- праектар;
- камп’ютэр;
- мультымедыйная прэзентацыя;
- відэафільм “Шляхам Коласа”
- выстава кніг;
- 2 карціны вучаніцы;
- лісты для рэфлексіі;
- жоўтыя лісточкі паперы;
- праграма містэрыі “Сымон-музыка”

**Эпіграф:**

**Жыта хвалюецца, сэрца на ўздыме,**
**Сэрца чакала такога даўно.**
**Слаўлю таго, хто абраў сваім імем**
**Колас, напоўнены спелым зярном.**
**Два каласы, дзве праўдзівыя песні**
**Побач ідуць, нібы сонца ў свет.**
**Колькі вы радасці людзям прынеслі,**
**Колас жытнёвы і Колас-паэт!**

**Р.Тармола**

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

*Слайд 1*

**Мультымедыя - ўрок-падарожжа,**
**прысвечаны 125-годдзю К.М. Міцкевіча,**
**“Шляхам Якуба Коласа”**
**з выкарыстаннем камп’ютэрных тэхналогій**

**Настаўнік**. *Сёння на ўроку будзем працаваць у 4 групах:*

1. даследчыкі;
2. тэарэтыкі;
3. творцы;
4. бібліятэкары.

*Настаўнік каменціруе слайды.*
*Слайд 2*

Задачы ўрока:

- здзейсніць завочнае падарожжа па мясцінах, звязаных з жыццём і творчай дзейнасцю Я.Коласа;
- правесці ўрок з прымяненнем камп'ютэрных тэхналогій;
- выказаць павагу і ўдзячнасць класіку беларускай літаратуры.

***Слайд 3***

**Эпіграф:**

**Жыта хвалюецца, сэрца на ўздыме,**
**Сэрца чакала такога даўно.**
**Слаўлю таго, хто абраў сваім імем**
**Колас, напоўнены спелым зярном.**
**Два каласы, дзве праўдзівыя песні**
**Побач ідуць, нібы сонца ў свет.**
**Колькі вы радасці людзям прынеслі,**
**Колас жытнёвы і Колас-паэт!**

**Р.Тармола**

***Слайд 4***

**Этапы ўрока:**

- **Маленства і юнацтва**
- **Настаўніцкая семінарыя**
- **Першыя паэтычныя спробы**
- **"Усімі сіламі, усім сэрцам служыць працоўнаму народу"**

***Слайд 5***

**Схема-карта "Стаўбцоўскія мясціны"**

*(настаўнік беларускай літаратуры расказвае пра маленства і юнацтва К.М. Міцкевіча)*




***Слайд 6***

Прагляд відэафільма "Шляхам Коласа", які расказвае пра мясціны, звязаныя з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка.

***Слайд 7***

Захавальніца музея-запаведніка Соф'я Іосіфаўна Міцкевіч – пляменніца вялікага беларускага пісьменніка

*(настаўнік беларускай літаратуры расказвае пра пляменніцу Я.Коласа).*



***Слайд 8, 9***

Вандроўка па мясцінах Я.Коласа *(вучні нагадваюць аб экскурсіі)*

 

***Слайд 10***

Маленства і юнацтва. Любімы занятак Кастуся – чытанне.



***Вучаніца.*** Рана абудзілася ў Кастуся Міцкевіча цікавасць да кнігі. Вучыцца чытаць ён прабаваў сам, для чаго карыстаўся такім спосабам: некаторыя літары чамусьці рабілі на будучага паэта большае ўражанне. Таму ён пытаўся ў таго, хто мог чытаць, як называецца тая ці іншая літара, і стараўся запомніць яе назву. Любімым заняткам для хлопчыка стала чытанне.

***Слайд 11***

З дзядзькам на рыбу. Карціна *П. Раманоўскага*



**Вучань.** “Дзядзька Антось – малодшы бацькаў брат,- успамінаў Я.Колас у аўтабіяграфіі. – Ён ведаў многа розных апавяданняў, казак і ўмеў цікава іх расказваць; ведаў многа песень; вельмі любіў дзяцей, умеў з імі ладзіць і добра разумеў дзіцячую псіхалогію.”

***Слайд 12***

Дзядзька Антось з дзецьмі. Карціна А. Малішэўскага



**Вучань.** Дзядзька Антось займаўся з дзецьмі лоўляй рыбы, збіраннем ягад і грыбоў, працаваў з імі каля дому,
на полі і на лузе. Усё гэта надавала багаты змест дзіцячаму жыццю.

***Слайд 13***

«Дарэктар» Іван Васільевіч Міцкевіч. 1907 г.

**Вучаніца.** Першая навука вялася дома. Кастусь і два яго старэйшыя браты Алесь і Уладзік вучыліся дома дзве зімы ў аднаго “дарэктара" – вясковага хлопчыка, скончыўшага пачатковую школу, якога бацька наняў за тры рублі на зіму.



У дзве нядзелі па Пакровах
Прывезлі Яську ў лапцях новых…
А сам дарэктар, з вузел ростам,
Ў сваім уборы бедным, простым,
У зрэбных портках і кашулі
Стаяў, як бы яго прыгнулі.

Так пісаў Я.Колас у паэме “Новая зямля”.

***Слайд 14***

**Вучаніца.** Асабліва падабаліся Кастусю Байкі Крылова. Зборнік твораў гэтага выдатнага байкапісца падарыў яму дзядзька Антось. “Крылоў доўгія часы быў маім богам, - так гаворыць паэт. – Поўны зборнік яго баек я вывучыў ледзь не на памяць.”

Разам з Крыловым прыйшлі і кнігі Пушкіна. Неўміручыя вобразы пушкінскай паэзіі пакінулі ў душы глыбокі след. У пастушковай торбачцы Кастуся ляжаў невялікі, даволі заношаны томік пушкінскай паэзіі. Ён мог прачытаць ад пачатку да канца “Палтаву”, “Браты-разбойнікі”, “Цыганы” і шмат лірычных вершаў. Яшчэ ў пачатковай школе трапіліся хлопцу вершы Янкі Лучыны. Гэтыя вершы ён вывучыў на памяць і любіў дэкламаваць.




***Слайд 15***

*(настаўнік беларускай літаратуры вядзе гутарку з вучнямі пра будынак школы, дзе вучыўся будучы пісьменнік.)*




***Слайд 16***

**Вучань.** Пісаць вершы Кастусь пачаў у 12-гадовым узросце, спачатку на рускай мове. Першым творам была байка “Лісіца і варона”. Але гэтая байка была бязлітасна высмеяна яго братам, пасля чаго Кастусь стаў скрытым паэтам.

І ўсё ж адзін верш “Вясна” ён захацеў прачытаць бацьку. Бацька пацалаваў сына і даў рубель гасцінца. Так ад бацькі Кастусь атрымаў свой першы літаратурны ганарар.




***Слайды 17-19***

**Вучаніца.** Два гады Я.Колас самастойна рыхтаваўся да экзаменаў і нарэшце ў 1898 годзе пераступіў парог Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. У семінарыі Я.Колас цікавіўся палітыкай, выступаў на літаратурных вечарах з чытаннем сваіх вершаў, жартоўных

апавяданняў і меў надзвычайны поспех сярод таварышаў, настаўнікаў і ўсёй гарадской публікі.

Настаўнік Нясвіжскай семінарыі Ф.А. Кудрынскі заўважыў і падтрымаў талент юнака Міцкевіча. Калі Я.Колас паказаў свой першы верш выдатнаму педагогу, ён пахваліў яго і сказаў: “Вось дзе ваша сапраўднае прызванне”.

Шмат часу семінарыст аддаваў чытанню кніг. Тут ён грунтоўна пазнаёміўся з творамі класікаў рускай і замежнай літаратуры: Пушкіна, Лермантава, Гогаля, Някрасава, Тургенева, Талстога.










***Слайды 20-21***

**Вучаніца.** Закончыўшы ў 1902 годзе настаўніцкую семінарыю, Я Колас паехаў настаўнічаць на Палессе. Сваю працу сціплага вясковага настаўніка ён лічыў самай пачэснай і паставіў перад сабой задачу: “…усімі сіламі, усім сэрцам служыць працоўнаму народу.” Першыя гады настаўніцтва прайшлі на Піншчыне, у вёсках Люсіна і Пінкавічы.







***Слайд 22***

**Вучань:** Рэвалюцыя 1905-1907 г.г. захапіла паэта сваімі вызваленчымі ідэямі, дапамагла яму глыбей зразумець інтарэсы народа і сваё месца ў барацьбе. У лістападзе 1905 г. малады настаўнік прымае ўдзел у сялянскіх хваляваннях, у выступленні сялян вёскі Пінкавічы супраць памешчыка Скірмунта, які адабраў у іх зямлю, а летам 1906 г. становіцца адным з арганізатараў нелегальнага настаўніцкага з’езда ва ўрочышчы Прыстанька, недалёка ад Мікалаеўшчыны.

За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе і напісанне рэвалюцыйнай пракламацыі Віленская судовая палата прыгаварыла яго да 3 гадоў турмы.



***Слайды 23-24***

**<u>Настаўнік.</u>** Першы верш К.Міцкевіча “Наш родны край” быў надрукаваны ў газеце “Наша доля” 1 (14) верасня 1906 г. пад псеўданімам Якуб Колас.

У 1910 годзе выйшаў з друку падрыхтаваны супрацоўнікамі рэдакцыі “Нашай нівы” першы зборнік вершаў “Песні жальбы”, горача сустрэты чытачамі і крытыкай.

У гэтым жа 1910 годзе была надрукавана кніга “Другое чытанне для дзетак беларусаў.”







***Слайд 25***

**<u>Вучань.</u>** У 1915 годзе паэта мабілізавалі ў армію. Служыў у запасным батальёне, а пасля заканчэння Аляксандраўскага ваеннага вучылішча – у Пермскім запасным палку, адкуль у 1917 годзе трапіў на румынскі фронт.



***Я.Колас 1916 г.***

***Слайды 26-27***

*Настаўнік расказвае пра сям’ю Якуба Коласа, яго жонку Марыю Дзмітраўну і трох сыноў.*







***Слайд 28***

**<u>Вучаніца.</u>** На працягу 1920-1950 г.г. Я.Колас напісаў самыя выдатныя свае творы: паэма “Новая зямля” (1923), паэма “Сымон-музыка” (1925), аповесці “У палескай глушы”, “У глыбі Палесся”, “На прасторах жыцця”, “Дрыгва”, паэмы “Рыбакова хата”, “Адплата” і іншыя.



Кнігі Я.Коласа, выдадзеныя ў 20-гады

**<u>Настаўнік.</u>** *У час вясновых канікулаў мы з вамі  пабывалі ў тэатры імя Я.Купалы, дзе прагледзелі містэрыю “Сымон-музыка”. Падзяліцеся, калі ласка, сваімі ўражаннямі. (Выказванні вучняў).*

***Слайд 29***

**<u>Вучань</u>**. Я.Колас працаваў у Мінскім педтэхнікуме і Беларускім Дзяржаўным універсітэце, а ў 1922 г. стаў членам Інстытута беларускай культуры, а ў 1929 г. – віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук БССР.

У 1926 г. за вялікія заслугі ў развіцці беларускай мастацкай літаратуры ўрад БССР прысвоіў яму ганаровае званне народнага паэта Беларусі.

*( расказаў пра жыццё Я.Коласа ў Мінску, куды ён пераехаў у 1921 годзе, пра яго захапленні.)*

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Якуб Колас эвакуіраваўся і жыў спачатку ў Клязьме (недалёка ад Масквы), а затым у Ташкенце. У 1944 г. пасля вызвалення Мінска вярнуўся на радзіму і займаўся творчай і навукова-грамадскай дзейнасцю. У 1954 г. завяршыў трылогію “На ростанях”. Марыў закончыць паэму “На шляхах волі”.

Памёр Якуб Колас 13 жніўня 1956 г.



Я.Колас у садзе
1952 г.



Я.Колас на
доследным участку
1952 г.

***Слайды 30-31***

*Настаўніца расказала аб наведванні Літаратурнага музеяЯ.Коласа ў Мінску, пра сустрэчу з яго сынамі Данілам і Міхасём.*



Літаратурны музей Якуба Коласа ў Мінску



Рабочы кабінет Якуба Коласа

***Слайд 32***

**Фізкультмінутка** *(настаўнік прагаворвае тэкст, а вучні выконваюць адпаведныя рухі)*

Кожную раніцу, выцягваючыся ва ўвесь рост, успомніце: “Я – чалавек”. Заўсёды гатовы ўстаць побач ці наперадзе, працягнуць руку дапамогі, лёгка  нахіліцца да малога ці

слабага, падставіць плечы пад груз трывог і клопатаў, павярнуцца да тых, хто адстаў, дацягнуцца да мары, выбіраць паміж жаданнямі і магчымасцямі, пераскочыць праз стомленасць і боль, падняцца пасля няўдачы, пранесці праз усё сваё жыццё дружбу і любоў, змагацца з уласным ценем, глыбока ўздыхнуць таму, што не збылося, і ўсміхнуцца таму, што збудзецца.

**Настаўнік.** *А зараз мы з вамі адгадаем рэбусы, якія змешчаны на слайдах.*

***Слайды 33-34***




**Адказы:** 1. Мікалаеўшчына.
2. Дзед Талаш.

***Слайды 35-36***

**Настаўнік.** *Як вы ведаеце, дзед Талаш з'яўляецца галоўным героем аповесці "Дрыгва" Я.Коласа. Пісьменнік неаднаразова з ім сустракаўся. Вось вы бачыце на слайдзе хату-музей, дзе жыў дзед Талаш.*


Я.Колас і дзед Талаш
г. Масква.




***Слайды 37-38***

**Настаўнік.** *Паспрабуем разгадаць яшчэ адзін рэбус.*



**Адказы:** 1. Якуб Колас. 2. Рак-вусач.

***Слайды 39-40***

**Асоба Я.Коласа ў творчасці мастакоў.**

*Настаўнік просіць вучняў звярнуць увагу на карціны Паўлоўскага і Шчамялёва.*





***Слайды 41-45***

**Тэст "Жыццёвы і творчы шлях Я.Коласа"**

*Вучні па слайдах адказваюць на пытанні.*

1. **Калі нарадзіўся  Якуб Колас?**
   - **1885 г.**
   - **1892 г.**
   - **1882 г.**

2. **Сапраўднае прозвішча Я.Коласа**
   - **Антось Казіміравіч Міцкевіч.**
   - **Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч**
   - **Іван Дамінікавіч Луцэвіч.**

3. **Як называўся першы зборнік вершаў Я.Коласа?**
   - **"Песні жальбы"**
   - **"Песні няволі"**
   - **"Родныя з'явы"**

4. **Дзе адбылася першая сустрэча Я.Коласа з Я.Купалам?**
   - **Мікалаеўшчына**
   - **Смольня**
   - **Мінск**

5. **Калі Я.Коласу прысвоена званне народнага пісьменніка Беларусі?**
   - **1926 г.**
   - **1950 г.**
   - **1938 г.**

Настаўнік: Зараз дадзім слова творчай групе вучняў.

*1. Вучаніца Пачкоўская Святлана дэманструе дзве свае карціны "Мой родны кут" і "Вянок Коласу", якія яна прысвяціла 125-годдзю славутага песняра.*

*2. Вучань Калугін Раман чытае свой верш, які таксама прысвяціў юбілею Якуба Коласа.*

***

**Яго Пан Бог у вусны цалаваў,**
**Каб слова змог людзям данесці.**
**Ён Коласам сябе назваў**
**Праз праўду беларусаў ў кнізе весці.**

**У спевах маці Нёман ажываў,**
**Разлучнікам стаяў і лёсаў, і кахання,**
**На ростанях край родны заміраў,**
**І разглядаў ён Кастусёвыя жаданні…**

**Крылова хлопчык палюбіў тварэнні,**
**Напэўна,  так ён  здолеў адшукаць**
**Сябе, знайсці з душой паразуменне,**

**Настаўнікам жыцця для дзетак стаць!**

**Паэтам стаў праз лёс неўміручым,**
**Сымон-музыка справядліва граў.**
**І на сваіх старонках творца вучыць**
**Жыццё хваліць, бо Госпад даў.**

**Ён помнік Слову будаваў у час цяжкі,**
**Калі не раз гарэла, руйнавалася зямля,**
**Калі на мінах падрываліся плужкі**
**І працу славіла айчынная ралля.**

**Настаўнік.** Зараз дадзім слова групе вучняў-бібліятэкараў, якія падрыхтавалі выставу кніг Якуба Коласа і літаратуры пра выдатнага пісьменніка *(выступленне вучняў-бібліятэкараў).*

*Слайд 46*
**Дамашняе заданне.**

- Змест артыкула "Я.Колас"
  стар.312-320 (8 балаў)
- Падрыхтаваць паведамленне "Агульнае ў жыццёвым і творчым лёсе Я.Купалы і Я.Коласа" (9-10 балаў)

*Слайд 47*
**Рэфлексія**
Настаўнік прапануе вучням вызначыцца з меркаваннем пра ўрок ("цікава", "карысна", "цяжка", "сумна") і прымацаваць лісты паперы ў пэўны сектар круга, змешчаны на дошцы.




***Слайд 48***
Настаўнік падводзіць вынікі ўрока і дзякуе вучням за падрыхтоўку, цікавыя выступленні, творчыя заданні.



# ДАДАТАК 1

**Мультымедыа - ўрок-падарожжа,
прысвечаны 125-годдзю К.М. Міцкевіча,
“Шляхам Якуба Коласа” X клас**


















Падагульняльны ўрок па тэме “Назоўнік” мае тэматычную накіраванасць – “Пад святлом каляднай зоркі”. Праведзены ў Год роднай зямлі, ён садзейнічае выхаванню ў дзяцей духоўнасці, пачуццё павагі да рэлігійных святаў і народных абрадаў. Камп’ютэрная падтрымка, кветка пуансэція, выцінанка на калядную тэму, калаж, музычнае суправаджэнне ствараюць атмасферу святочнасці і загадкавасці.

Кластэр “Назоўнік”, праца ў парах і групах, выбарачны дыктант, крыжаванка “Калядныя персанажы”, праца з руска-беларускім слоўнікам, тэст даюць магчымасць для паўтарэння, сістэматызацыі ведаў вучняў па пройдзенай тэме.

Урокі з выкарыстаннем камп’ютэрных тэхналогій з’яўляюцца эфектыўным матэрыялам для работы з адоранымі дзецьмі.

# НАЗОЎНІК
## (“Пад святлом каляднай зоркі”)
## Падагульняльны ўрок
## з выкарыстаннем кам’ютэрных тэхналогій
## (VI клас)

**Мэты і задачы ўрока:**

- з дапамогай камп’ютэрнай прэзентацыі стварыць умовы для паўтарэння і сістэматызацыі ведаў па тэме «Назоўнік»;
- садзейнічаць выхаванню ў падрастаючага пакалення духоўнасці, пачуцця павагі да рэлігійных свят і народных абрадаў;
- садзейнічаць развіццю навыкаў працы ў пары і ў групе.

**Тып урока:** з выкарыстаннем камп’ютэрных тэхналогій.

**<u>Абсталяванне ўрока:</u>**

- камп’ютэр;
- праектар;
- выцінанкі;
- карткі;
- калаж на калядную тэму;
- вазон з пуансэціяй;
- кластэр “Назоўнік”;
- сімвал “Калядная зорка”;
- ацэначныя лісты;
- 2 зорачкі ў кожнага вучня.

**<u>Эпіграф урока:</u>**

Неба і зямля радасна спяваюць –
І анёлы свету дзіва абвяшчаюць

### Ход урока

**І. Арганізацыйны момант.**

*Настаўнік праводзіць каментар слайдаў.*

**ІІ. Уступнае слова настаўніка.**

**Настаўнік.** Сёння ў нас незвычайны ўрок, які прысвячаем вялікаму святу Каляды. Калядны тыдзень пачаўся 7 студзеня і працягваецца да 19 студзеня, свята Вадохрышча.Сімвалам урока з’яўляецца калядная зорка, якая будзе асвятляць наш шлях да ведаў. Парадуемся і ўсміхнёмся адзін аднаму, пажадаем поспехаў у працы.

*Настаўнік праводзіць каментар слайдаў.* Называе мэту, задачы і эпіграф урока.

*Слайд 1*




*Слайд 2*



**Настаўнік.** На стале ў кожнага з вас ляжыць ацэначны ліст. На працягу ўрока пасля кожнага этапу вы будзеце ставіць адзнакі ў адпаведную графу ацэначнага ліста.

*Слайд 3*




**III. Работа з кластэрам “Назоўнік”.**

На дошцы прымацаваны ліст з кластэрам “Назоўнік”.

**Настаўнік.** Звернем увагу на ўпрыгожаную шарыкамі ёлку. Кожнай гронцы шарыкаў адпавядае пэўная група назоўнікаў. Успомнім групы назоўнікаў і іх марфалагічныя прыметы. (Адказы дзяцей:

1. адушаўлёныя і неадушаўлёныя;
2. агульныя і ўласныя;
3. канкрэтныя і абстрактныя;
4. рэчыўныя і зборныя;
5. маюць род;
6. маюць скланенне;
7. змяняюцца па ліках, склонах.)

**IV. Праца з наглядным матэрыялам.**

**Настаўнік.** Звернем увагу на выцінанкі.

**Выцінанкі** – дэкаратыўнае мастацтва выразання. Здаўна народныя ўмельцы стваралі ўзоры, арнаменты, якімі ўпрыгожвалі інтэр’ер хаты да святаў Каляды і Вялікдзень.

Перад вамі - святочны калядны калаж. На ілюстрацыях адлюстравана, як рыхтуюць да свята куццю, як варожаць, калядуюць.

У калядны перыяд расцвітае пакаёвая кветка пуансэція. Паглядзіце на яе ярка-чырвоныя лісточкі і палюбуйцеся яе прыгажосцю.

- Складзём і запішам тры сказы, пачаткам якіх з’яўляюцца словы: калядная зорка, выцінанка, пуансэція. Вызначце, якім членам сказа з’яўляюцца назоўнікі. Чаму ў сказах стаяць працяжнікі?

*Слайд 4*



IV. **Самастойная работа па картках у парах** (два варыянты).

*Слайд 5*




Заданне - агульнае для ўсіх.

**Заданне.** Падкрэсліце адной рыскай агульныя назоўнікі, а дзвюма рыскамі - уласныя.

**Варыянт 1**

**Каляды** – гэта лацінскае Календы ці, прасцей кажучы, кола. Свята прыпадае на час, калі сонца паварочвае на вясну. Павялічваецца дзень, а ў прыродзе пачынаецца абуджэнне.

Хрысціяне адзначаюць дзень нараджэння Ісуса Хрыста.

Каляды – гэта цэлы комплекс народных абрадаў.

*З газеты*

**Варыянт 2**

Надышлі Калядкі!
Напяклі аладкі.
Мы надралі таркаю
Дранікі духмяныя.
Хочаш – еш са скваркаю,
Хочаш – са смятанаю.
Вось вам, калі ласка,
З жэрдачкі каўбаска!
Вось кавалак пірага,
Каб не брала вас туга.

*З газеты*

Праверка выканання задання.

**VI. Выбарачны дыктант.** Гучыць беларуская народная песня “Калядачкі” ў выкананні ансамбля “Песняры”. Вучні павінны на слых выбраць з тэксту назоўнікі, запісаць іх, вызначыць лік.

*Слайды 6, 7*






## V. Прэзентацыя фотаздымкаў са свята “Калядныя сустрэчы”.

**Настаўнік.** У даўніну на святыя Каляды разам з калядоўшчыкамі па вёсках і мястэчках вандраваў незвычайны лялечны тэатр батлейка. У калядныя святочныя дні ў навучальных установах адбываюцца калядныя сусрэчы, выступаюць тэатральныя калектывы. Паглядзіце некалькі фотаздымкаў фальклорна-драматычнага тэатра “Несцерка”.

*Слайды 8,9,10*










## VI. Крыжаванка “Калядныя персанажы”.

*Слайды.*







1. Абавязковы калядны персанаж (*каза)*.
2. Чалавек, які сустракае гасцей (*гаспадар*).
3. Жанчына, якая варожыць, танцуе (*цыганка)*.
4. Нячыстая сіла (*чорт)*.
5. Радасны персанаж, сімвал дабрабыту і еднасці чалавека з прыродай *(конь)*.
6. Чалавек у форме для парадку *(жаўнер)*.
7. Памочнік, носіць мех з падарункамі. Калі ён у бярозе, шукае цёплы кут *(мядзведзь)*.

**Настаўнік.** Прачытаем у вертыкальным слупку слова “Здароўе”. 2008 год аб’яўлены годам Здароўя.

Да якой групы адносяцца ўсе разгаданыя назоўнікі? *(адушаўлёных)*.

**IX. Фізкультхвілінка** (выконваецца з рухамі).

*Слайд*



**Настаўнік**. Чаму выдзелена ў нас слова *госцейкі*? (*зваротак).*

**X. Праца з руска-беларускім слоўнікам** (паказ слайдаў).

**Заданне.** Запішыце ў сшытак пераклад слоў з рускай мовы: яблык, вінаград, апельсін, ананас, кавун.
















**Настаўнік.** Назавіце слова, у якім не супадае род у рускай і беларускай мовах *(яблык – мужчынскі род).*

**XI. Работа з кластэрам "Сімвал года – 2008".**

**Настаўнік.** На стале ў кожнага з вас магічная лічба **8**. Каб быць здаровым, трэба шмат працаваць над сабой. На слайдзе вы бачыце словы станоўчыя і адмоўныя. Ваша задача: у верхняй палавіне лічбы 8 запісаць словы, якія станоўча характарызуюць чалавека. А ў ніжняй – адмоўныя рысы характару, ад якіх вы хацелі б пазбавіцца. Да якой групы адносіцца запісаныя назоўнікі? *(абстрактныя).*

*Слайды*







**XII. Выкананне тэсту па тэме "Назоўнік" .**

**Настаўнік.** Адказы запішыце ў сшытку.

Паказ слайдаў.

**1. Адзначыць назоўнікі з канчаткамі –у, -ю**

а) вецер з поўдн..;
б) кроплі дождж..;
в) многа шчасц..;
г) аб Алег…

**2. Вызначыць назоўнікі мужчынскага роду**

а) яблык;
б) сабака;
в) гусь;
г) качаня.

**3. Вызначыць множналікавыя назоўнікі**

а) золата;
б) канікулы;
в) імяніны;
г) радасць.

**4. Вызначыць нескланяльныя назоўнікі**

а) метро;
б) моладзь;
в) Баранавічы;
г) ВНУ.

**5. Вызначыць назоўнікі агульнага роду**

а) запявала;
б) сястра;
в) чысцюля;
г) дрэва.

Праверка вынікаў тэсту.

**1. Адзначыць назоўнікі з канчаткамі –у, -ю**

а) вецер з поўдн..;
б) кроплі дажджу; (1 бал)
в) многа шчасц..;
г) аб Алегу. (1 бал)

**2. Вызначыць назоўнікі мужчынскага роду**

а) яблык; (1 бал)
б) сабака; (1 бал)
в) гусь;
г) качаня.

**3. Вызначыць множналікавыя назоўнікі**

а) золата;
б) канікулы; (1 бал)
в) імяніны; (1 бал)
г) радасць.

**4. Вызначыць нескланяльныя назоўнікі**

а) метро; (1 бал)
б) моладзь;
в) Баранавічы;
г) ВНУ. (1 бал)

**5. Вызначыць назоўнікі агульнага роду**

а) запявала; (1 бал)
б) сястра;
в) чысцюля; (1 бал)
г) дрэва.

**XIII. Падвядзенне вынікаў урока.**

**Настаўнік.** Вы сёння на ўроку добра папрацавалі. Успомніце, чым мы з вамі займаліся. Падлічыце ў ацэначным лісце, колькі балаў вы набралі. Вызначце сярэдні бал.

***Ацэначны ліст***

| **Работа па картках (у парах)** | **Выбарачны дыктант** | **Кластэр "Сімвал года-2008"** | **Тэст** | **Сярэдні бал** |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

**XIV. Дамашняе заданне.**




**XV. Рэфлексія.**

**Настаўнік.** У вас на стале дзве зорачкі. Тыя, каму спадабаўся ўрок, падыміце зорачку чырвонага колеру, а каму не - сіняга колеру. Дзякуй за працу на ўроку!